# БРАЦКАЯ МАГІЛА
# (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. СТУДЗЁНКА)



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь): 613Д000586**

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Студзёнка

**Каардынаты:** 53.968293, 28.258201

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1944 г.) ў в. Студзёнка Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі. У 1984 г. на магіле пастаўлена стэла. Пахаваны 14 воінаў 873-га знішчалага процітанкавага артылерыйскага палка 33-й арміі.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1944 гг.) ў в. Студзёнка Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000586**), які унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Помнік знаходзіцца на ўсходняй ускраіне вёскі. У 1984 г. на магіле пастаўлена стэла, выкананая з чорнага граніту. На надмагільнай пліце, таксама з чорнага граніту, выбіты імёны загінуўшых. На помніке зверху намалявана зорка, пад надпісам маецца каласок залатога колеру. Маеца надпіс: “СЛАВА ПАВШИМ ГЕРОЯМ”. На пліце запісаны імёны загінуўшых.

Пахаваны 14 воінаў 873-га знішчалага процітанкавага артылерыйскага палка 33-й арміі, якія загінулі з ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна вайну ад нямецка-фашысцкіх захпонікаў і ліквідацыі групоўкі войск праціўніка ў мінскім катле, і 2 партызаны, што загінулі ў баях з гітлераўцамі ў 1944 г. Сярод пахаваных – Героі Савецкага Саюза старшы сяржант ***Цяплоў Міхаіл Фёдаравіч*** і старшы лейтэнант ***Смірноў Фёдар Андрэевіч***.

**Смірноў Фёдар Андрэевіч** нарадзіўся 6 лютага 1914 г. у с. Ліпін Бор Вашкінскага р-на Валагодскай вобласці ў сялянскай сям’і. Член КПСС з 1939 г. Працаваў сакратаром райкома камсамола на радзіме.

З 1937 г. у Чырвонай Арміі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942 г. Камандзір узвода 873-га процітанкавага артылерыйскага палка 33-й арміі старшы лейтэнант Ф. А. Смірноў вызначыўся пры вызваленні Смалявіцкага раёна і разгроме нямецка-фашысцкай групоўкі ворага ў мінскім “катле”.

5 ліпеня 1944 г. каля былой вёскі Раткоўшчына ўзвод Ф.А. Смірнова на працягу 5 гадзін адбіваў контратакі праціўніка. Байцы загінулі ў баі, але ворага не прапусцілі. Было знішчана каля 300 гітлераўцаў, 30 павозак 5 гармат, 2 мінаметы, 4 кулямётныя кропкі. Да канца бою на батарэі не засталося ў жывых ніводнага савецкага воіна, загінуў і сам камандзір. Званне Героя Савецкага Саюза Ф.А. Смірнову прысвоена 24 сакавіка 1945 г. На радзіме ўстаноулены бюст героя, яго імем названа вуліца.

**Цяплоў Міхаіл Фёдаравіч** нарадзіўся 21 лістапада 1918 г. ў с. Юрас Пінежскага р-на Архангельскай вобласці у сялянскай сям'і. Член КПСС з 1942 г.

З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. Камандзір гарматы 873-га процітанкавага палка старшы сяржант М.Ф. Цяплоў вызначыўся пры разгроме варожай групоўкі ў мінскім "катле".

На найбольш небяспечным участку – на паўднёвы захад ад Роткаўшчыны займала пазіцыю 5-я батарэя пад камандаваннем капітана І.А.Малькаўца. Ведаючы сваіх падначаленых, капітан на высунутую наперад пазіцыю 5 ліпеня 1944 г паставіў разлік старшага сяржанта М.Ф.Цяплова. Гармата Цяплова вяла трапны агонь. Пасля шостай атакі, падтрыманай самаходкамі, Цяплоў быў паранены, але працягваў бой. Калі загінуў апошні баец яго разліку, старшы сяржант сам падносіў снарады, сам зараджаў, наводзіў гармату і трапна страляў. Калі гармата была пашкоджана, працягваў адбівацца ад насядаўшых гітлераўцаў аўтаматным агнём, а калі скончыліся патроны, апошняй гранатай узарваў сябе разам з пяццю гітлераўцамі, якія акружылі яго.

Званне Героя Савецкая Саюза прысвоена 24.03.1945 г. На радзіме яго імем названы саўгас, Дом піянераў, вуліца. У в. Карпагоры Пінежскага раёна пастаўлены помнік.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Андрушчэнка, Н. К. Дарогамі подзвігаў. Помнікі і памятныя мясціны рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы на Міншчыне / Н. К. Андрушчанка. – Мн. : Беларусь, 1978. – 204 с.

2. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

4. Навечна ў сэрцы народным: энцыклапедычны даведнік / гл. рэд. І. П. Шамякін. – 3-е выд., дап. і выпр. – Мінск : БелСЭ, 1984. – 607 с.

5. Найдаражэйшы скарб: [пра помнікі гісторыі і культуры Міншчыны] / В. А. Ляшковіч. – Мінск : Полымя, 1985. - 143, [1] с.

6. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.